# Хто і як здымае фінансавыя вяршкі з палітычных рашэнняў паміж Кіевам, Масквой і Менскам?

**Расейска-ўкраінскі канфлікт. Дзякуючы пасярэдніцтву ў перамовах паміж двума бакамі афіцыйны Менск у свой час наладзіў добрыя дачыненні з краінамі Захаду. Была з гэтага і эканамічная выгада для Беларусі. Вось толькі накіроўвалася яна не толькі дзяржаве, але і асабіста ў кішэню бізнесоўцу, набліжанаму да Аляксандра Лукашэнкі.**

**Хто і як здымае фінансавыя вяршкі з палітычных рашэнняў паміж Кіевам, Масквой і Менскам? У нашым новым матэрыяле – супольнае расследаванне з легендарнай украінскаю праграмаю «Схемы».**

## Даўні партнёр Крамля

Новы палітычны скандал ды эскалацыя напружанасці паміж Масквой і Кіевам. Украінскія ўлады змясцілі пад хатні арышт галоўнага прарасейскага палітыка Украіны **Віктара Медведчука**. Яго падазраюць у спробе крадзяжу нацыянальных рэсурсаў у захопленым расейцамі Крыме, перадачы расейскім спецслужбам звестак, якія змяшчаюць дзяржаўную таямніцу, а таксама антыўкраінскай дзейнасці.

«Рашэнні відавочна палітычныя і выбарачныя, накіраваныя толькі на адно – зачысціць палітычнае поле ад тых сілаў, якія выступаюць за мірнае пераадоленне крызісу на паўднёвым усходзе Украіны, у Данбасе, і за добрасуседскія адносіны з Расеяй», – каментуе падзеі ў суседняй краіне на паседжанні Савету бяспекі расейскі прэзідэнт **Уладзімір Пуцін**. «Гэта, безумоўна, пытанне, якое павінна заўсёды быць у полі нашай увагі, і мы своечасова, належным чынам, маючы на ўвазе тыя пагрозы, што для нас ствараюцца, павінны будзем на гэта рэагаваць».

Арыштаваны Віктар Медведчук не проста палітычны партнёр Крамля. Ён называе сябе сябрам кіраўніка Расеі ды ягоным кумам. Уладзімір Пуцін і жонка колішняга расейскага прэзідэнта **Дзмітрыя Мядзведзева** разам хрысцілі дачку Медведчука Дар’ю. У 2009 годзе Пуцін напісаў хвалебнае эсэ пра Медведчука ў часопісе «Главред». Пазней кіраўнік Расеі распавядаў, што пазнаёміўся з украінскім палітыкам, калі той быў кіраўніком адміністрацыі прэзідэнта Кучмы (2002–2005), а галоўным ягоным партнёрам на той час быў Дзмітрый Мядзведзеў, бо тады ачольваў Адміністрацыю прэзідэнта Расеі. «У іх і цяпер вельмі добрыя стасункі», – падкрэсліваў у 2017 годзе Уладзімір Пуцін.

Сёлета Медвядчук увайшоў у спіс найбагацейшых людзей Украіны, складзены часопісам «Forbes». Украінскія медыі пішуць, што свае фінансавыя активы ён укладаў у нарошчванне палітычнага ўплыву сваёй прарасейскай партыі «Апазіцыйная платформа – За жыццё» (ОПЗЖ). Актывы, як



*Віктар Медведчук. Фота: https://www.facebook.com/MEDVEDCHUKVV/*

правіла, афармляліся на ягоных паплечнікаў альбо жонку, тэлевядоўцу **Аксану Марчанку**. Сфера бізнес-інтарэсаў шырокая: медыі, нерухомасць, металургія, паліўна-энергетычны комплекс. Да прыкладу, у Расеі гэта нафтавы і нафтаперапрацоўчы бізнес. «Forbes» ацэньвае капітал Медведчука на $ 620 млн.



# Виктор Медведчук

**ТЭК, медиа, металлургия, недвижимость**

**$620 млн**

**12 место**
100 богатейших украинцев
2021

**Профайл**

Возраст — 66

Место рождения — поселок Почет, Красноярский край (Россия)



*З часопіса «Forbes». Фота: https://forbes.ua/*

Як выявіла нашае расследаванне супольна з украінскаю праграмаю «Схемы», узбагачацца на нафтавым бізнесе ў абыход украінскіх санкцыяў Медведчуку дапамагалі і ў Беларусі. У медыях ужо паведамлялі пра магчымыя дзелавыя сувязі Медведчука з набліжаным да ўладаў Беларусі бізнесоўцам **Мікалаем Вараб’ём.**




*Мікалай Варабей. Фота: TUT.BY*

Але нашае міжнароднае расследаванне дазволіла высветліць, што сувязі гэтыя глыбейшыя і пакрываюцца вышэй, чым гэта ўяўлялася дасюль. Першапачаткова на нас выйшлі нашыя ўкраінскія калегі з праграмы «Схемы» і папрасілі дапамагчы з інфармацыяй пра беларускага бізнесоўца. У працэсе ліставання і размоваў мы пастанавілі рабіць супольны матэрыял.




## Звязаныя адною трубою

2019 год. Ва Украіне ідуць электаральныя баталіі. Спярша прэзідэнцкая, потым парламенцкая кампаніі. На гэтым фоне галоўны прарасейскі палітык сустракаецца ў Маскве з Дзмітрыем Мядзведзевым, а ў Сочы – адначасова з Уладзімірам Пуціным і **Аляксандрам Лукашэнкам**.




Апрача таго, ажно два разы кум Пуціна сустракаецца асобна з Лукашэнкам у Менску.




*Сустрэча Аляксандра Лукашэнкі і Віктара Медведчука. Фота: https://president.gov.by/*

Фармальна ён прыязджаў у Беларусь на паседжанне кантактавай групы для ўрэгулявання канфлікту на Данбасе. Але ўкраінскі пасол у Беларусі Ігар Кізім казаў, што не бачыў яго там.

«Мяне таксама гэта здзіўляе і выклікае пытанні. Асабліва тое, што ён называецца ўдзельнікам трохбаковай кантактавай групы. Хоць я ў Менску ўжо года паўтара не бачыў яго на паседжаннях групы. Можа, ён, вядома, сустракаецца з удзельнікамі групы. Але, на маё асабістае меркаванне, так называцца не зусім карэктна», – казаў у інтэрв’ю парталу TUT.by **Ігар Кізім.**



Украінскі пасол выказаў меркаванне, што на сустрэчах Медведчука з Лукашэнкам маглі абмяркоўвацца пытанні бізнесу. Увесну таго ж 2019 года пасля ўсіх згаданых сустрэчаў Варабей набывае ўкраінскі ўчастак трубаправоду «Самара – Заходні кірунак», які перапампоўвае нафтапрадукты з Расеі праз Беларусь ва Украіну і далей на Еўразвяз.




*Трубаправод Самара – Заходні кірунак. Фота: https://euroradio.pl/*

«Ва ўкраінскіх палітычных і дзелавых колах у прынцыпе разумеюць, што Мікалай Мікалаевіч [Варабей] рашэнне пра далучэнне да гэтага праекту не прыняў бы без блаславення з боку прэзідэнта. Такія праекты, завязаныя на палітыку і з інтарэсамі ў Расейскай Федэрацыі, напэўна, усё ж такі не прыватная ініцыятыва», – адзначае дырэктар кансалтынгавай групы «А-95» **Сяргей Куюн**.

Пасля распаду Савецкага Саюзу доўгі час трубаправод належаў расейскай «Транснафце». За тры гады да таго, як магістраль набыў Варабей, яе купіла малавядомая швейцарская кампанія «International Trading Partners AG» з бенефіцыярам **Анатолем Шэферам.**



Украінскія адмыслоўцы мяркуюць, што нікому не вядомы Шэфер быў толькі намінальным уласнікам.




«Я не сустракаў людзей, якія б ведалі яго. І ў дзелавых колах гэта наогул нікому не вядомы персанаж. Але пагалоска пачала звязваць набыццё і актыўную працу магістралі ў 2016 годзе з імем прарасейскага палітыка Віктара Медведчука. Ён усяляк адмаўляе сваю датычнасць да гэтага праекту, але па масе прыкметаў, пра што пішуць СМІ, усё ж такі нейкі ўплыў там ёсць. І, ў прынцыпе, мы разумеем, што пры сапраўднай і кровапралітнай вайне зрэалізаваць ва Украіне расейскі праект, напэўна, усё-такі, можа не кожны», – адзначае Сяргей Куюн.




## Нафтавыя схемы ў абыход санкцыяў

Пасля куплі труб Мікалай Варабей у інтэрв'ю парталу TUT.by заяўляў, што будзе пастаўляць па ёй ва Украіну беларускія нафтапрадукты. Але, па факце, па ёй, у асноўным, ішлі пастаўкі дызельнага паліва з Расеі на адрас кампаніі «Wexler Group», якую звязваюць з Медведчуком.

У пастаўках расейскага паліва ва Украіну быў задзеяны і Мікалай Варабей. Цягам мінулага года ягоная менская кампанія «БелКазТранс» увозіла ва Украіну дызельнае паліва пераважна расейскага паходжання.

А ў некаторых выпадках нават пазначаны вытворца дызпаліва. Гэтая расейская «Башнафта», што пад украінскімі санкцыямі з 2016 года.




Атрымальнікамі ж тавару былі кампаніі, звязаныя з Медведчуком: «Анвітрэйд» і «Глуско Украіна». Іншымі словамі, Варабей выступаў пасярэднікам, каб пастаўляць лідару прарасейскага палітычнага крыла ва Украіне паліва ад забароненых у гэтай краіне расейскіх кампаніяў.

«На жаль, у нас абыходзяць гэтыя санкцыі. То бок, санкцыі ва Украіне дрэнна працуюць, таму мы і бачым на ўкраінскім рынку прадукты кампаніяў пад санкцыямі», – адзначае галоўны рэдактар украінскага выдання «НафтоРинок» Аляксандр Сірэнка.

Яшчэ адну хітрую схему Варабей і Медвядчук ажыццяўлялі праз Эстонію. У жонкі кума Пуціна, Аксаны Марчанкі, быў нафтаперапрацоўчы завод у Растоўскай вобласці, у Навашахцінску. Як выявіла нашае расследаванне, нафтапрадукты з гэтага заводу паступалі ва Украіну праз эстонскую кампанію «NT Marine». У прыватнасці – дарожны бітум. Яшчэ адна эстонская фірма, «NT Bunkering», увозіла ў Еўропу лёгкі дыстылят з Навашахцінскага заводу нафтапрадуктаў цягам 2018–2020 гадоў. У пачатку гэтага года Украіна наклала на гэты завод санкцыі за пастаўкі паліва данецкім і луганскім сепаратыстам.






«Працавалі з ДНР і ЛНР – гэта злачынства адназначна. Будзьце ласкавыя адказваць. Санкцыі, забарона, закрыццё віду дзейнасці - так гэта павінна працаваць. Вось гэта сапраўдныя санкцыі. Калі хтосьці лічыць, што ён разумнейшы за іншых, тады доказная база і судовыя разборы», – каментуе Аляксандр Сірэнка.

Эстонскія кампаніі, праз якія навашахцінскія нафтапрадукты паступалі ва Украіну і Еўропу, падкантрольныя тамтэйшаму бізнесоўцу **Аляксею Чульцу**. А ён у сваю чаргу – даўні партнёр Вараб'я.



Актывамі Вараб’я і Чульца ў Маскве кіруе адзін і той жа чалавек – **Аляксей Лысянкоў.** Ён дырэктар вараб’ёўскага «БелКазТрансу» ў Маскве і адначасова фірмы «Юларус», падкантрольнай Чульцу. А таксама мае невялікія долі ў абедзвюх гэтых расейскіх кампаніях.

## Грошы партыі

Таксама пры дапамозе Вараб’я ўкраінская прарасейская партыя «ОПЗЖ» нарошчвала і палітычны ўплыў ва Украіне. За апошнія 3 гады паплечнік Медведчука **Тарас Козак** скупіў ва Украіне ажно 3 тэлевізійныя каналы: «112 Украіна», «News One» і «Zik». Угоды паводле двух з іх афармляліся праз «Абсалютбанк», які належыць Вараб’ю.

Як выявіла супольнае расследаванне з праграмаю «Схемы», сёлета Тарас Козак лётаў прыватным бізнес-джэтам «Embraer Legacy 650» разам з менеджарамі Вараб’я: **Алаю Пінчук і Аляксандрам Храмцовым** з Кіева ў Менск і назад.




Самалёт каштуе каля $ 50 млн, а пералёт на падобныя адлегласці – у сярэднім каля € 20 тыс. «Але калі гэта менавіта прыватны самалёт, які ім далі, каб яны паляцелі, то, адпаведна, яны маглі нічога і не плаціць», – кажа журналіст праграмы «Схемы» (радыё «Свабода», Украіна) Міхаіл Ткач.

Апрача таго, кум Пуціна і ягоная жонка захоўваюць у Беларусі істотныя сродкі. На іхныя імёны адкрытыя рахункі ў «Абсалютбанку». Медвядчук там трымае € 48 тыс. Ягоная жонка – € 108 тыс. На Аксану Марчанку таксама адкрыты даверчы траставы рахунак у расейскіх рублях на суму, эквівалентную $ 10 млн, а таксама даверчы траставы рахунак на € 2 млн. Для Медведчука ж «Абсалютбанк» таксама трымае акцыі газпромаўскай «дачкі» ў Вялікай Брытаніі. Ад гэтага ж банку ў верасні 2019 года Медвядчук атрымаў ганарар на суму больш за $ 90 тыс.







*Віктар Медведчук і Аксана Марчанка. Фота: instagram.com/oksana.marchenko.official/*

Чаму ж кум Пуціна праварочвае свае ключавыя ўгоды праз Беларусь? У 2019 годзе, калі гэтая супраца актывізавалася, новаабраны прэзідэнт Украіны **Уладзімір Зяленскі** распачаў ціск на прадстаўнікоў «русского мира» ва Украіне.

«Да партыі Медведчука яшчэ ёсць вялікія пытанні: ці гэта ягоная партыя, ці там часовае аб’яднанне, і хто яны такія. Ёсць вялікія пытанні, адкуль у іх грошы на фінансаванне партыі, адкуль грошы

на фінансаванне каналаў. У нас ёсць адказы, адкуль аб’ёмы кэшу і з якой краіны яны ўсё гэта атрымліваюць. І гэта будзе вельмі гучная гісторыя, якая скончыцца вельмі дрэнна», – казаў у інтэрв’ю тэлеканалу «1+1» Зяленскі.

Сёлета ўкраінскія ўлады спынілі трансляцыю каналаў, што належаць медведчукоўскаму паплечніку Тарасу Козаку. Афіцыйная прычына – падазрэнне, што яны фінансуюцца з продажу вугалю з непадкантрольных Кіеву тэрыторыяў Данбасу. Медвядчук, як ужо гаварылася, застаецца пад хатнім арыштам па падазрэнні ў дзяржаўнай здрадзе і крадзяжы прыродных рэсурсаў у Крыме. А трубаправод, набыты Вараб’ём, арыштаваны ўкраінскім судом і перададзены дзяржаўнай «Укртранснафце».

## Манаполія на транзіт

Штопраўда, гэта далёка не адзіная дзялянка, з якой улады Расеі і Беларусі дазваляюць карміцца гэтаму бізнесоўцу. Варабей – адзіны прыватнік, якому дазволена экспартаваць нафтапрадукты, выробленыя з расейскай нафты на мазырскім і наваполацкім нафтаперапрацоўчых заводах.

Дасюль экспартам беларускіх нафтапрадуктаў займаліся выключна дзяржаўныя структуры: «Беларуская нафтавая кампанія» і «Белзамежгандаль», якія ўваходзяць у «Кіраўніцтва справамі прэзідэнта». Цяпер пераважная большасць беларускага бензіну і дызелю ідзе ў Еўропу, у тым ліку праз вараб’еўскую «Новую нафтавую кампанію».

Яшчэ адна дзялянка, вылучаная Вараб’ю, – транспартаванне расейскага вугалю.

Праз колькі гадоў пасля пачатку ваеннага канфлікту на Данбасе Беларусь пачынае актыўна нарошчваць пастаўкі вугалю ва Украіну, увайшоўшы ў 2019 годзе ў тройку лідараў. Тады адгрузілі больш за 2,5 млн тонаў, хаця яшчэ ў 2014-м такіх паставак увогуле не было.




І гэта пры тым, што ў Беларусі не здабываюць каменнага вугалю. Ва Украіну перапрадаюць расейскае цвёрдае паліва.

«Самой Беларусі шмат вугалю не трэба – 700-800 тысяч тонаў за год. Адпаведна, у існых умовах, вашыя кампаніі (дзяржаўныя або прыватныя) карыстаюцца спрыяльнаю кан’юнктурай і зарабляюць грошы», – адзначае прамысловы эксперт з Расеі **Леанід Хазанаў.**

Гульцы на рынку не выключалі, што разам з расейскім вугалем на ўкраінскі рынак можа трапляць і паліва з акупаваных тэрыторыяў Данецкай і Луганскай вобласцяў. З гэтай нагоды Служба бяспекі Украіны распачала некалькі крымінальных справаў, дзе фігуравалі і беларускія кампаніі-транзіцёры.




«Імпартаваны вугаль здабываецца на непадкантрольнай тэрыторыі Украіны і транзітам праз Расейскую Федэрацыю ды Рэспубліку Беларусь увозіцца на тэрыторыю Украіны, а грошы ад пазначанай супрацьпраўнай дзейнасці накіроўваюцца на падтрыманне незаконных узброеных фармаванняў, што дзеяць на ўсходзе Украіны», – адзначылі ў матэрыялах адной з крымінальных справаў.

Напрыканцы таго ж 2019 года на вугальным рынку адбываецца своеасаблівы перадзел. Эксклюзіўнае права на транзіт расейскага вугалю па Беларусі атрымлівае вараб'еўскі «БелКазТранс». Расейская чыгунка не ўзгадняла адпраўнікам вугалю дакументаў, калі экспедытарам была пазначаная іншая кампанія. Гульцы на рынку кажуць, што гэтае распараджэнне было спушчанае з Крамля.

Кіраўнік «БелКазТрансу» **Сяргей Саковіч** у каментары выданню Naviny.by тлумачыў атрыманне манаполіі на транзіт расейскага вугалю па Беларусі наступным чынам:

«Гэта каб упарадкаваць усю працу і разумець, якія аб'ёмы, каб яна не ішла хаатычна. Вельмі шмат усялякіх таварышаў, якія лішнія аб'ёмы [перавозяць]. Каб яно не стаяла нідзе, не было навалы [вагонаў] нідзе. Чыста для таго, каб усё разгрупаваць, пакласці на палічкі».

Да сёння «БелКазТранс» застаецца адзіным экспедытарам расейскага вугалю па Беларусі, паведамілі гульцы на рынку. Дзякуючы асаблівым умовам кампанія выбілася ў лідары на лагістычным рынку. У выручцы яна заняла трэцяе месца сярод ста самых паспяховых экспедытараў пасля «СТА Лагістык» і транспартава-экспедыцыйнага прадпрыемства Беларускай чыгункі БТЛЦ.

Годам раней яна займала шостае месца.

«Калі Мікалай Верабей мае цесныя сувязі з уладамі Беларусі, то для яго ніякай праблемы няма развязаць пытанне пра эксклюзіўны транзіт вугалю з Расеі ва Украіну, бо, ў прынцыпе, ён можа дамагчыся таго, што камусьці ветліва параяць гэтым больш не займацца», – каментуе Леанід Хазанаў.

Ва Украіне склалася аналагічная сітуацыя адносна перавозкі вугалю. Там манаполію на транспартаванне аддалі «БелКазТранс Украіне». Але, у адрозненне ад Беларусі, мясцовыя экспедытары доўгі час спрабавалі адбіцца ад яе паслугаў.







Некаторы час украінскі рынак быў у ступары. «БелКазТранс Украіна» не мела дамовы з Украінскаю чыгункаю. Цяпер, як паказаў аналіз падатковай справаздачнасці, вялікая частка фінансавых выдаткаў «БелКазТранс Украіны» прыпадае на аплату паслуг менавіта «Украінскай чыгункі», а асноўнымі платнікам на карысць экспедытара сталі буйныя прамысловыя прадпрыемствы, падкантрольныя мясцовым алігархам. То бок «БелКазТранс Украіна» заняла істотную нішу на рынку лагістыкі.

«Паводле звестак нашых кампаніяў, якія займаюцца транзітам і імпартам вугалю, гэта найбуйнейшы ў аб'ёмах транзіцёр. То бок, ніхто, акрамя яго, не можа атрымаць дазволу перавозіць вугаль чыгункаю», – зазначае прэзідэнт «Асацыяцыі міжнародных экспедытараў Украіны» **Віктар Берасценка.**

Также нам стало известно, из обращений экспедиторов, о еще одной компании монополисте, услуги которой навязываются. Так нам сообщается, что причина отказа в согласовании заявок экспедиторов заключается в том, что с 1 декабря назначен единственный экспедитор при транзите угля через территорию Украины. Им стала компания «Белказтранс Украина», связанная с деятельностью Николая Воробья. Из обращений экспедиторов следует, что РЖД в декабре отклоняет заявки компаний, ранее работавших по сопровождению грузов через Украину. Дело в том, что правительство России назначило единственным экспедитором компанию Н. Воробья «Белказтранс Украина», у которой пока нет договора с «Украинской железной дорогой», в этом и причина приостановки транзита. По нашим оценкам, транзит российского угля по территории Украины достигает 7–9,5 млн т в год (600–800 тыс. т в месяц).

По информации из СМИ, руководитель группы оценки рисков устойчивого развития АКРА Максим Худалов оценил потенциальные убытки российских производителей угля: *«если поставки не наладятся до конца декабря, в 3–3,7 млрд руб. при средней цене экспорта около $75 за тонну на границе Украины»*.

Просим принять вышеизложенную информацию к сведению и содействовать с решением вопроса по монополизации рынка транспортных транзитных перевозок угля через Украину в Европу.

**С уважением,**
**Генеральный директор АМЭУ** **В.В. Берестенко**

*Са звароту Асацыяцыі міжнародных экспедытараў Украіны да расейскіх калегаў*

«Расейская чыгунка» адмовілася каментаваць транспартаванне вугалю па Беларусі і Украіне праз «БелКазТранс» і «БелКазТранс Украіну».

## Украінская сям’я і бітумны бум

Галоўным бенефіцыярам «БелКазТранс Украіны» ёсць Мікалай Варабей. Спачатку мы думалі, што гэта сам беларускі бізнесовец. Але гэта не так. У часе нашага расследавання супольна з праграмаю «Схемы» выявілася, што ва Украіне жыве першая жонка Мікалая Вараб’я – **Таццяна Церахава**. Яна працуе настаўніцай у адной з сярэдніх школаў Кіева. Ад шлюбу з Церахавай бізнесовец мае двух сыноў: Сяргея і Мікалая.



Апрача сына беларускага алігарха, бізнесам ва Украіне займаецца і ягоная нявестка **Валерыя Варабей**. Яна валодае паловаю кампаніі «Укрбелнафтапрадукт» каля Івана-Франкоўску, што займаецца агулавым гандлем нафтапрадуктаў.

Але вернемся да «БелКазТранс Украіны». Кампанія адыграла цікавую ролю яшчэ ў адной гісторыі – бітумнай. Летась украінскі прэзідэнт Уладзімір Зяленскі распачаў маштабны праект рамонту і будаўніцтва дарог, праз што выкарыстанне бітуму ва Украіне значна вырасла. Пакольні ўкраінскія вытворцы не ў стане цалкам задаволіць унутранага попыту, на падмогу прыйшлі беларускія заводы. На іх прыходзіцца каля 70 % усіх паставак.



*«Нафтабітумны завод». Фота: https://www.facebook.com/neftebitum/*

Дзякуючы дзяржаўнай замове беларускія прадпрыемствы ўдвая нарасцілі пастаўкі бітуму ва Украіну, у тым ліку вараб'еўскі Нафтабітумны завод. З чэрвеня мінулага года пастаўкі прадукцыі з гэтага заводу ішлі не толькі наўпрост, але ў тым ліку і праз «БелКазТранс Украіну». Прычым кампанія завозіла тавар паводле коштаў, што былі ў сярэднім прыкладна на $ 50 вышэй, чым у астатніх дастаўцаў. Праўда, вараб'ёўскі бітум лічыцца і лепшым паводле якасці.

«Цяпер падчас будаўнічага буму і вялікага попыту на бітум цэнаўтварэнне ў нас не лагічнае, і кожная кампанія, якая займаецца пастаўкамі, жадае зарабіць, выціснуць з гэтага праекту максімум», – каментуе галоўны рэдактар украінскага выдання «НафтоРинок» Аляксандр Сірэнка.

Вялікая будоўля ва Украіне працягваецца. І ў беларускіх прадпрыемстваў ёсць усе шанцы на ёй зарабіць. Нават заходнія санкцыі гэтаму не перашкода.

«І дзяржаўныя, і калядзяржаўныя беларускія кампаніі зробяць усё, каб працягнуць пастаўкі ва Украіну. Гэтага ж хочуць і ўкраінскія кампаніі, бо гэта недалёка. Гэта ж не везці бітум морам з Іспаніі ці з Італіі. Я думаю, што будзе зроблены нейкі абыход гэтых санкцыяў», – лічыць Аляксандр Сірэнка.

## Нябачныя санкцыі

Яшчэ адзін буйны, але ўжо беларускі праект з удзелам Вараб'я-старэйшага, – будаўніцтва лагістычнага комплексу «Брэміна-Ворша». Ягоныя партнёры ў гэтым бізнесе – **Аляксандр Зайцаў і Аляксей Алексін.**

Пад будаўніцтва лагістычнага хабу Аляксандр Лукашэнка стварыў фактычна падатковы афшор на мяжы з Расеяй. Менавіта праз блізасць да ўладаў Варабей – адзіны з усёй тройцы бізнесовец, які трапіў пад персанальныя санкцыі Еўразвязу. Але ён знашоў выйсце: перапісаў актывы на сваіх менеджараў.

«Ён перапісаў свой базавы актыў «Чырвоны Бор», на які былі завязаныя ўсе астатнія. То бок, на «Чырвоны Бор» былі запісаныя кампаніі «Інтэрсэрвіс» (буйны нафтатрэйдар), а на «Інтэрсэрвіс» запісаныя і «Абсалютбанк», і «Новая нафтавая кампанія», і «Нафтабітумны завод». То бок, фактычна змяніўшы ўласнікаў у адной кампаніі, ён змяніў уласнікаў усяго свайго бізнесу – асноўных актываў. Гэта зроблена для таго, каб выйсці з-пад заходніх санкцыяў», – лічыць журналіст-расследавальнік **Ігар Ільяш.**




Новая суўласніца «Чырвонага Бору» і дырэктарка «Інтэрсэрвісу» **Алеся Беражная** аперацыю перапісвання актываў пракаментавала лаканічна: «Так склаліся абставіны».




Пакуль не заўважна, што еўрапейскія санкцыі неяк адбіліся на бізнесе Вараб'я. Наадварот, выглядае на тое, што ён спакойна вядзе свае справы. Перад вялікімі травеньскімі выходнымі мы заспелі Вараб'я ў Менскім аэрапорце. У той дзень з Анапы прыляцеў бізнес-джэт «Gulfstream G450».




*Мікалай Варабей у Мінскім аэрапорце*

Цягам апошняга года гэты самалёт рэгулярна курсуе паміж Менскам, Масквой і Кіевам. А таксама Эстоніяй, дзе працуе партнёр Чулец, і Швейцарыяй, дзе жыве жонка Вараб’я.




З аэрапорту Мікалай Варабей паехаў у кірунку Віцебшчыны. У Верхнядзвінскім раёне месціцца турыстычны комплекс «Чырвоны Бор», што належыць бізнесоўцу. Недалёка ад яго, у вёсцы Лешня, – сядзіба Вараб’я. На яго запісаныя тры дамы агульнай плошчаю 900 квадратных метраў. У красавіку 2019 года два самыя буйныя дамы – па 430 і 440 квадратных метраў – былі набытыя амаль за $ 4 млн.



*Сядзіба Вараб'я ў вёсцы Лешня*

Ёсць у сямейства маёмасць і ў Наваполацку ды Менску. У сталіцы на жонку Вараб'я Тамару запісаная 4-пакаёвая кватэра недалёка ад Парку Перамогі. Яе ацэньваюць ад $ 300 тыс.




Дачка **Кацярына Смушковіч** валодае 3-пакаёваю кватэраю на праспекце Машэрава. Яе ацэньваюць ад $ 180 тыс. Як бачым, уладкаваліся яны няблага.




Мы спрабавалі пагаварыць з Мікалаем Вараб’ём. Хадзілі да яго ў офіс, званілі і пісалі ягонай памочніцы, накіравалі запыты ў ягоныя кампаніі. Але бізнесовец не ідзе на кантакт. А вось Віктара Медведчука ўдалося спытаць пра ягоныя стасункі з Мікалаем Вараб’ём. Кум Пуціна сказаў, што яны сябруюць, але не маюць супольных бізнес-інтарэсаў.